БЕЛАРУСКАЕ АДЗЕННЕ



Па гарызанталі: 1. Старадаўняя мужчынская адзежына ў выглядзе кафтана. **5.** Прылада для насуквання ніТак на цэўкі. **8.** Цені, штрыхі, якія наносяцца на малюнак, карту. **10.** Перыяд устрымання ад скаромнай ежы; у час ... хадзілі ў адзенні, у якім адсутнічаў чырвоны колер. **12.** Машына, якая адначасова выконвае работу некалькіх машын. **13.** Востры край рэжучай прылады. **16.** Выгнутая металічная паласа, якая служыць ручкай у дзвярах, сундуках. **17.** Надкаленная косць. **18.** Тое, што шыецца (разм.). **19.** Невялікая прэснаводная рыба сямейства карпавых. **21.** Белы клён. **22.** Пляма іншага колеру на чым-небудзь. **25.** Сатырычнае адлюстраванне каго-, чаго-небудзь. **27.** Даўней: галаўны ўбор замужняй жанчыны. **28.** ... з поясам; аснова мужчынскага беларускага строю. **29.** ... Раманюк. Імя беларускага прафесара, мастака, этнографа, які першым зрабіў мастацтвазнаўча-этнаграфічнае раяніраванне беларускага народнага адзення і сабраў яго вялікую калекцыю.

Па вертыкалі: 1. Тулава чалавека. **2.** Далікатнасць. **3.** Пласт зямлі на глыбіню палатна рыдлёўкі. **4.** Адна з геаметрычных фігур, якая часта прысутнічае ў арнаментацыі беларускіх строяў; лічылася, што фігуры выконваюць магічную ролю абярэгаў. **5.** Беларускае жаночае паяснoе адзенне: доўгая шырокая спадніца з ваўнянай саматканкі ў рознакаляровую кветку. **6.** 17-я літара лацінскага алфавіта. **7.** Падоўжаныя ніткі ў тканіне. **9.** Лёгкая баваўняная тканіна рэдкага пляцення. **11.** Шырокі мужчынскі пояс, якім некалі спавівалі немаўлят. **14.** ... або гарсэт; жаночая безрукаўка, частка святочнага касцюма. **15.** Саламяны капялюш. **18.** Вузенькая стужка на краі тканіны іншага колеру або іншага ўзору. **20.** «Будзеш ... ты прасці,// Будзеш ткаці кросны». З верша Янкі Купалы «Алеся». **22.** Балотная птушка сямейства ястрабіных. **23.** Баваўняны аксаміт (устар.). **24.** Найдрабнейшая часцінка хімічнага элемента. **25.** Дзе дарога, там і ... (прык.). **26.** Грашовая адзінка Францыі і В'етнама.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Кунтуш. 5. Сукала. 8. Тушоўка. 10. Пост. 12. Камбайн. 13. Лязо. 16. Скаба. 17. Рэпка. 18. Шыва. 19. Лінёк. 21. Явар. 22. Крапіна. 25. Шарж. 27. Намітка. 28. Кашуля. 29. Міхась. **Па вертыкалі:** 1. Корпус. 2. Такт. 3. Штык. 4. Ромб. 5. Саян. 6. Ку. 7. Аснова. 9. Сярпянка. 11. Спавівач. 14. Кабат. 15. Брыль. 18. Шлячок. 20. Кужаль. 22. Каня. 23. Пліс. 24. Атам. 25. Шлях. 26. Су.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.23	16.47	7.24
Віцебск —	9.20	16.29	7.09
Магілёў —	9.13	16.37	7.24
Гомель —	9.01	16.43	7.42
Гродна —	9.37	17.04	7.27
Брэст —	9.29	17.14	7.45

Месяц

Поўня 14.12—20.12.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Георгія, Мікалая, Савы, Фёдара.* ***К.*** *Альбіны, Здзіслава, Себасцьяна, Яўсея.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЗАЎТРА



БПС-СБЕРБАНК

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка»

Организатор рекламной игры – Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11. Рекламная игра «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка» проводилась на территории Республики Беларусь. Срок начала рекламной игры – 1 июля 2016 года, срок окончания – 23 декабря 2016 года. Свидетельство о государственной регистрации № 2789, выданное Министерством торговли Республики Беларусь «23» июня 2016г. В рекламной игре участвовало 133 674 человека. Призовой фонд разыгран полностью.

Победители рекламной игры:

1. Соколовский Д.С. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 6.12.2016г.

2. Мелешкевич А.П. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 6.12.2016г.

3. Николаев А.Г. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 6.12.2016г.

4. Яцевич В.С. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 11.10.2016г.

5. Ивановская Е.Н. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 11.10.2016г.

6. Моцук А.В. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел. рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 11.10.2016г.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 8(029)6208673

УНП 191720959

Даты | Падзеі | Людзі

16 СНЕЖНЯ

1498 год — заснаваны Полацкі кляштар бернардзінцаў. Дзейнічаў да 1832 года. Знаходзіўся пры ўпадзенні ракі Палата ў Заходнюю Дзвіну. Заснаваны вялікім князем літоўскім Аляксандрам з мэтай схілення праваслаўных гараджан да каталіцызму. Магчыма, тут атрымаў пачатковую адукацыю першадрукар Францыск Скарына.

1730 год — нарадзіўся Міхал Казімір Агінскі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Адыграў значную ролю ў культурным жыцці Беларусі, Літвы і Польшчы. З 1764 года — ваявода віленскі, з 1768-га — гетман вялікі літоўскі, адзін з кандыдатаў Кацярыны II на польскі трон. У 1771 годзе перайшоў на бок барскіх канфедэратаў, але яго атрад быў разбіты, і Агінскі эміграваў. У 1775 г. вярнуўся ў Беларусь. Жыў у Слоніме, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, стварыў оперны тэатр і капэлу. Пісаў музычныя і літаратурныя творы. Выдаў кнігу «Казкі і не казкі». Па яго ініцыятыве і на яго сродкі будаваўся Агінскі канал. Памёр у 1800 годзе.

1876 год — 140 гадоў таму нарадзіўся (г. Масква) Яўген Уладзіміравіч Клумаў, удзельнік Мінскага антыфашысцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар. У Вялікую Айчынную вайну (з восені 1941 г.) працаваў у 1-й гарадской бальніцы: дапамагаў параненым падпольшчыкам і партызанам, забяспечваў падполле і партызанскія атрады медыкаментамі і хірургічным інструментам, цалкам абсталяваў два партызанскія шпіталі. У кастрычніку 1943 г. арыштаваны гітлераўцамі, адмовіўся з імі супрацоўнічаць і разам з жонкай Г. Клумавай у 1944 годзе закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Мінску яго імем названы вуліца і 3-я клінічная бальніца, на будынку якой устаноўлена мемарыяльная дошка.

1901 год — нарадзіўся Мікалай Фёдаравіч Ватуцін, савецкі палкаводзец, генерал арміі (1943), Герой Савецкага Саюза (1965, пасмяротна). У гады Вялікай Айчыннай вайны быў начальнікам штаба шэрагу франтоў, намеснікам начальніка Генеральнага штаба, камандуючым войскамі Паўднёва-Заходняга, Варонежскага і 1-га Украінскага франтоў. Праявіў палкаводчы талент у Сталінградскай і Курскай бітвах, бітве за Дняпро, у Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі. Унёс значны ўклад у развіццё ваеннага майстэрства. Памёр ад ран.

1903 год — нарадзіўся Іван Восіпавіч Ахрэмчык, жывапісец, народны мастак Беларусі, прафесар. Працаваў у галіне партрэта, тэматычнай карціны, пейзажа, манументальнага жывапісу. Стварыў сюжэтна-тэматычныя карціны, якія вызначаюцца гістарычнай дакладнасцю: «Падпісанне маніфеста аб утварэнні БССР», «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск», «Арганізацыя савецкай улады ў Гомелі» і інш. Адна з найлепшых яго прац — «Абаронцы Брэсцкай крэпасці». У гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічаў з выданнем «Раздавім фашысцкую гадзіну». Напісаў партрэты У. Уладамірскага, Я. Міровіча, П. Пестрака і іншых. Працаваў таксама ў жанры пейзажа. Памёр у 1971 годзе.

Было сказана

Сяргей ДЗЯРГАЙ, паэт:
«Не можа ўратаваць
Саломінка ў віры жыцця тапельца».

УСМІХНЕМСЯ

На вуліцы галалёд. Мара аб тым, што ўсе мужчыны будуць каля маіх ног, пачынае ажыццяўляцца. Пакуль схадзіла ў краму, двум дапамагла ўстаць, а з адным нават паляжала!

Маленькі хлопчык прывык пастаянна бачыць маму ў джынсах. І раптам яна апранула сукенку. Дзіця ў шоку:

— Мама! Дык ты дзяўчынка ці што?

Мужчынскія пачуцці лепш за ўсё правяраюцца ў краме жаночага адзення.

У адрозненне ад Англіі ў нас няма другога снедання, затое ёсць трэцяя вячэра!

Звычайна на вяселлі крадуць нявесту, а ў мяне ўкралі цешчу.

Больш дарагіх падарункаў за гэты на вяселлі не было.

Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.158. Індэкс 63850. Зак. № 4969.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 снежня 2016 года.